# Вобразнае вырашэнне серыі памятных манет «Беларускія народныя легенды»

Вольга ЛАБАЧЭЎСКАЯ



Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва, прафесар, доктар мастацтвазнаўства, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: lobachevskaja@tut.by

Алена БОГАНЕВА



Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклору, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: elboganeva@gmail.com

Серыя памятных манет «Беларускія народныя легенды» складаецца з сямі манет з выявамі галоўных персанажаў беларускіх этыялагічных легендаў, сярод якіх бусел, зязюля, жаўранак, чарапаха, мядзведзь, снягір (гіль), пчолы. Навуковае абгрунтаванне і канцэпцыя серыі былі распрацаваны намі па заказе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Серыя была ўвасоблена ў жыццё ў 2007–2017 гг. Аўтарам мастацкага вырашэння з’яўляецца Аксана Навасёлава, супрацоўніца Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Завяршэнне стварэння і выпуску серыі памятных манет «Беларускія народныя легенды» дазваляе ацаніць гэты праект як значны ўнёсак у пашырэнне ведаў аб каштоўнасцях нашай нацыянальнай культуры ў краіне і па-за яе межамі, як дзейсны сродак захавання і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Мастацкае вырашэнне дзвюх манет серыі атрымала высокую ацэнку міжнароднай нумізматычнай супольнасці. На конкурсе «Манетнае сузор’е» ў Санкт-Пецярбургу ў Расіі манета «Легенда пра бусла» атрымала ў 2008 г. 1-е месца ў намінацыі «Срэбная манета года» [1], манета «Легенда пра зязюлю» – 2-е месца ў намінацыі «Манета года» ў 2009 г. [2]. Арганізатар конкурсу – Расійскі выдавецкі дом «Уотэр Марк» (г. Санкт-Пецярбург), выдавец спецыялізаванага часопіса аб манетах і медалях «Залаты чырвонец» і арганізатар Міжнароднай канферэнцыі і выставы манет COINS (КОИНС).

Спынімся на спецыфіцы тэмы памятных манет, прысвечаных беларускім народным легендам, і асаблівасцях вобразна-мастацкага вырашэння серыі.

Легенда – параўнальна малавядомы жанр народнай прозы (у адрозненне ад казкі), таму варта акрэсліць падрабязней яго зместавую спецыфіку. У савецкі час народныя легенды знаходзіліся на перыферыі грамадскіх інтарэсаў па прычыне іх «рэлігійнасці». Даследчы інтарэс да легендаў як віду народнай творчасці ўзнаўляецца толькі з сярэдзіны 1990-х гг.

Серыя манет прысвечана беларускім этыялагічным легендам – легендам пра паходжанне. Гэта самыя старажытныя легенды і, па сутнасці, з’яўляюцца «сколкамі» былых міфаў пра паходжанне сусвету і ўсяго, што ў ім ёсць. Разам з тым, за апошнюю тысячу гадоў легенды існавалі ў рэчышчы хрысціянскай культуры, якая наклала на іх выразны адбітак.

Этыялагічныя легенды адказваюць на адвечныя пытанні аб прычынах і заканамернасцях светабудовы, якія паўстаюць перад чалавекам: як быў створаны свет і ўсё, што ў ім; чаму вонкавы выгляд, унутраныя ўласцівасці, характарыстыкі жывых істот і прыродных аб’ектаў такія, якія мы бачым цяпер; чаму сацыяльнае жыццё чалавека арганізавана такім, а не іншым чынам; адкуль пайшлі тыя ці іншыя звычаі, святы, абрады і г. д.

Сярод этыялагічных легендаў звычайна вылучаюць *касмаганічныя* (пра паходжанне зямлі, неба, космасу, сусвету); *антрапагенічныя* (пра паходжанне чалавека, яго біялагічныя і сацыяльна-культурныя асаблівасці, якасці); *заагенічныя* (пра паходжанне жывёл, іх уласцівасці, якасці, адносіны да іх чалавека); *гербагенічныя* (пра паходжанне раслін і іх асаблівасці); *пра паходжанне міфічных істот* (русалак, «фараонаў», іншых персанажаў ніжэйшай міфалогіі) і інш.

З вялікага вобразна-тэматычнага арсенала міфалогіі беларусаў, адлюстраванай у народных легендах з пункту гледжання выяўленчасці, старажытнасці і характэрнасці для беларускай традыцыйнай культуры мы палічылі мэтазгодным выбраць сем этыялагічных заагенічных сюжэтаў – пра паходжанне птушак, жывёл і насякомых. Перад мастачкай Аксанай Навасёлавай стаяла няпростая творчая задача – знайсці сродкі выразнасці, здольныя перадаць іх як істот прыроднага свету, і візуальнымі сродкамі выявіць той уяўны вобраз, які быў створаны беларусамі ў апавяданнях. Міфалагічны складнік зместу старажытных легендаў патрабаваў пошуку адпаведнай мастацкай мовы і сродкаў выразнасці. Як вядома, пераклад вербальнага тэксту на мову візуальнага вобраза – адна з найбольш складаных задач у выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Выявы на манетах запаўняюць усю паверхню рэверса, упісаны ў кола. Ракурс, паварот выяў персанажаў стварае ўражанне напружанага руху, які, нібы спіраль, разгортвае іх касмічную дынаміку і па-за межамі манеты. Рытм кампазіцыі, фактурна распрацаваная паверхня абрысу фігур кантрастуе з гладкім паліраваным фонам рэверса, што дазваляе гледачу адчуць вымярэнне міфалагічнага часу з'яўлення і існавання вобразаў легендаў. Такім чынам, глядач успрымае разам з канкрэтным зместам апавядання кожнай легенды таксама глыбінную кантэкстуальнасць усёй тэматычнай серыі памятных манет.

Выявы бусла, зязюлі, жаўранка, чарапахі, мядзведзя, снегіра (гіля), пчалы вырашаны плоскасна і перадаюць найбольш распазнавальныя рысы гэтых істот. Іх абрыс запоўнены дэкаратыўна-рэльефнай фактурай, якая надае манеце ювелірную каштоўнасць твора дробнай пластыкі. Такі прыём таксама служыць мэце мастацка-вобразнага аповеду пра асаблівасці матываў і персанажаў легенды. Дробныя дэталі сведчаць аб свеце чалавека, аб тым, што героі легендаў некалі, да свайго пераўтварэння ў бусла, зязюлю, жаўранка, мядзведзя і інш., былі людзьмі, і што яны жывуць побач з чалавекам. Разглядаючы манеты, бачым разнастайныя арнаменты і фактуры народных тканін, умоўныя выявы, якія пазначаюць прастору існавання чалавека – дрэвы, хаты, млыны, вуллі, жаночыя пацеркі; вынікі чалавечай працы – каласы, зерне і самога чалавека: жанчыну, мужчыну, дзіця, сілуэты якіх злітыя, з'яднаныя з выявамі народных легендаў. Крыніцай для распрацоўкі фактурна-рэльефнай разнастайнасці паверхні манет паслужылі багатыя ўзоры беларускага народнага ткацтва, вышыўкі, карунак. Арнаментальнасць удала счытваецца як знак беларускага зместу і нацыянальнай прыналежнасці серыі памятных манет.

За аснову мастацка-вобразнага вырашэння аверса манеты ўзята выява кола – знака вечнага руху, бесперапыннай сувязі сённяшняга з мінулым і будучым. Кола са спіцамі ўсярэдзіне таксама асацыіруецца з вярчэннем кола самапрадкі-калаўрота. Гэта рэч цесна звязана з традыцыйнай культурай беларусаў, з працэсам прадзення. Пад раўнамернае вярчэнне кола калаўрота бабулі і маці на вячорках распавядалі дзецям і ўнукам легенды, казкі і паданні пра мінулае. У гэтым кантэксце кола, адлюстраванае на аверсе манет, становіцца знакам пераемнасці, перадачы традыцый ад старэйшага пакалення моладзі. Агульнае кампазіцыйнае вырашэнне аверса серыі ў кожнай асобнай манеце дапоўнена сілуэтнымі выявамі персанажа, якому прысвечана манета, і яго атрыбутамі.

Агульны мастацкі стыль з манетамі маюць інфармацыйныя лістоўкі і сертыфікаты срэбных манет. Кожная з лістовак адметна сваёй колеравай гамай.

Падрабязней разгледзім вобраза-зместавы складнік памятных манет серыі і асаблівасці іх мастацкага вырашэння.

Буслу належыць адно з першых месцаў у народных уяўленнях беларусаў пра птушак. Гэта асаблівая, «божая», «святая» птушка. Вобраз бусла ўспрымаецца як знак Беларусі і яе зямлі. Бусел выступае ў народных уяўленнях як абсалютна разумная істота, надзеленая таксама і высокімі маральнымі якасцямі. Вытокі своеасаблівых адносін беларусаў да бусла выдатна тлумачыць легенда пра яго паходжанне, якая з'яўляецца адным з самых папулярных этыялагічных сюжэтаў у беларусаў, што захаваўся ў сельскай традыцыйнай культуры да сённяшняга дня.

Адпаведна сюжэту, бусел раней быў чалавекам. Бог даручыў яму кінуць у мора (бездань, яму і да т. п.) завязаны мех (торбу, гаршчок, скрыню) з разнастайным гадаўём (шкоднымі насякомымі, грызунамі, змеямі) і забараніў яго раскрываць і цікавіцца, што ў ім. Чалавек не вытрымаў і развязаў мех. Усё гадаўё ў адзін момант распаўсюдзілася па свеце, а чалавек за непаслухмянасць быў пераўтвораны ў бусла, які ходзіць па свеце і збірае сабе на спажыванне ўсю тую жыўнасць, што выпусціў з меха.

Рэверс манеты (*малюнак 1*) адлюстроўвае сімвалічна-вобразны змест беларускай народнай легенды пра паходжанне бусла. Выява бусла набывае касмічнае (міфалагічнае) гучанне, прастора вакол




*Памятная манета «Легенда пра бусла» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2007 г.*

***Малюнак 1***




*Беларуская памятная манета «Легенда пра зязюлю» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2008 г.*

***Малюнак 2***




*Памятная манета «Легенда пра жаваранка» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2009 г.*

***Малюнак 3***

яго, замкнёная ў круг, – гэта зямля і космас, а жаба і змяя ўспрымаюцца як месяц і сузор'і на зорным небе.

Адным з самых распаўсюджаных і папулярных у беларусаў сярод легендаў пра зязюлю (налічваецца звыш 20 разнастайных версій і варыянтаў, якія тлумачаць паходжанне гэтай птушкі) з'яўляецца сюжэт пра пакрыўджаную маці, якой непаслухмяныя дзеці не падалі вады, калі яна захварэла. Маці па чарзе прасіла сваіх дзяцей прынесці ёй вады, але кожнае дзіця адмаўляла ёй, спяшаючыся ісці гуляць. Тады маці з сумам стала каля акна, раскінула рукі і пераўтварылася ў зязюлю. Дзеці ўбачылі, як маці адлятае ў выглядзе птушкі ад роднай хаты, сталі бегчы за ёй, зваць і плакаць. Але было позна, маці да іх не вярнулася.

На рэверсе манеты (*малюнак 2*) выява зязюлі нагадвае птушку-жанчыну. У яе «чалавечае» вока, кругі-грудзі і рукі-крылы, абрысы якіх нагадваюць узмах доўгіх рукавоў жаночай вопраткі ў танцы. Геаметрычны рамбічны арнамент асацыіруецца адначасова як з арнаментам народнай вышыўкі, так і з пярэстым апярэннем, якое мае гэтая птушка. Умоўныя фігуркі дзяцей выразна падкрэсліваюць жаночую сутнасць вобраза. Малюнак адной дзіцячай фігуркі ў авале і дэкаратыўныя авалы-яйкі па полі манеты, якія нібы лунаюць у касмічнай прасторы, непасрэдна адсылаюць гледача да сюжэта легенды і выклікаюць прамыя асацыяцыі як з падкінутымі зязюлінымі яйкамі, так і птушынымі яйкамі, якія зязюляня, з'явіўшыся на свет, адразу выкідвае з чужога гнязда.

Характар вобраза зязюлі драматычны. Выявы яе галавы, дзюбы маюць рысы драпежнай птушкі. Рытм дэкаратыўных элементаў вопраткі-апярэння стварае ўнутраную напругу, уносіць дысананс у гармонію і раўнавагу. Гэта невыпадкова, бо ў народных легендах і павер'ях зязюля паўстае то ахвярай, то грэшніцай, то прадказальніцай лёсу і будучыні, яна здольная пераўтварацца ў драпежную птушку і выступае ў ролі пасрэдніка паміж жывымі і мёртвымі.

Жаваранак у традыцыйнай культуры беларусаў – адна з «чыстых», «боскіх» птушак, сімвал вясны, прасторы, волі, радасці. Жаваранка (птушку, якую асабліва шануюць) у беларусаў забаранялася выкарыстоўваць у ежу, а забіць яе лічылася цяжкім грахом (як і ў выпадку з буслам і зязюляй, якія маюць легендарнае паходжанне «з чалавека»).

Першыя жаваранкі прылятаюць ранняй вясной – у лютым – сакавіку, якраз перад пачаткам сяўбы. Пачуць або ўбачыць жаваранка пасля зімы лічылася добрай прыкметай. Птушка павольна і амаль вертыкальна падымаецца ў вышыню на некалькі дзясяткаў і нават сотню метраў, і яе песня можа гучаць бесперапынна больш за паўгадзіну.

Вобраз жаваранка прысутнічае ў веснавой каляндарнай абраднасці беларусаў. Так, у Дзень Сарака пакутнікаў на беларускім Падзвінні (пераважна Віцебская вобласць) пякуць птушачак з цеста, якіх называюць «жаўранкі». Гэтых «жаўранкаў» дзеці падкідваюць угору, каб хутчэй пryляцелі сапраўдныя жаваранкі, дзяўчаты прыгаворваюць над імі на шчаслівае замужжа.

Этыялагічныя беларускія легенды пра жаваранка адрозніваюцца паэтычнасцю і мастацкай выразнасцю. Згодна адной з іх жаваранак быў утвораны з камяка зямлі, падкінутай першым чалавекам, Адамам, уверх. Адам пасля выгнання з раю працаваў на полі, і яму было невыносна сумна і горка. Адам пачаў маліцца, і Бог загадаў яму кінуць камяк зямлі ў неба. Ён падкінуў зямлю ўверх – і замест камяка зямлі ўверх паляцеў жаваранак, які сваім звонкім спевам суцешыў Адама і дапамог прымірыцца са сваім лёсам.

На рэверсе манеты (*малюнак 3*) змешчана выява птушкі, якая ахінула сваімі крыламі зямлю і чалавека. Вобразна-мастацкае вырашэнне кампазіцыі перадае ўяўленне аб міфалагічнасці прасторы і часу, характэрнае традыцыйнаму светапогляду чалавека. Апярэнне птушкі нагадвае малюнак баразнаў узаранага поля. Выява жаваранка адзначана знакам ромба і касога крыжа, якія адлюстроўваюць яго сімвалічную сувязь з зямлёй і боскім пачаткам.

Вобраз чарапахі з'яўляецца надзвычай міфалагічным і сімвалічным у традыцыйнай культуры ў многіх народаў свету, у тым ліку і ў фальклоры беларусаў. Знешні выгляд і біялагічна-марфалагічныя асаблівасці чарапахі, у прыватнасці наяўнасць моцнага панцыра, які здольны вытрымліваць вялікую нагрузку, «змяіная галава», пасяленне побач з водным асяроддзем абумовілі функцыянальнасць міфапаэтычнага вобраза. У касмаганічных міфах галоўная функцыя чарапахі – служыць апорай зямлі і яе ўвасабленнем. У беларускіх касмалагічных уяўленнях чарапаха таксама адыгрывае ролю трымальніка свету нароўні з велізарнай рыбай, трыма кітамі і інш.




*Памятная манета «Легенда пра чарапаху» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2010 г.*

***Малюнак 4***




*Памятная манета «Легенда пра мядзведзя» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2012 г.*

***Малюнак 5***

Чарапаха ў міфалогіі розных народаў з'яўляецца сімвалам мудрасці, а таксама павольнасці жыцця, плаўнага яго цячэння. Чарапаха асацыіруецца з усім ціхаходным, трывалым, стабільным, а з негатыўным адценнем значэння – косным, аморфным, непаваротлівым, што, у прыватнасці, адлюстроўвае беларуская прымаўка «Паўзе як чарапаха».

Беларускія легенды аб паходжанні чарапахі маюць некалькі сюжэтных версій, дзе чарапаха паходзіць: 1) з крылатай змяі, якая нападала на людзей і клявала іх у галаву, пакуль Бог не накрыў яе чэрапам; 2) з удава (гадзюкі), што паядаў людзей; 3) з жанчыны, якая схавалася ад грому пад ночвы замест таго, каб хрысціцца; 4) з жанчыны-пляткаркі, якую Бог накрыў чэрапам, каб глядзела толькі сабе пад ногі.

Ва ўсіх варыянтах гэтага сюжэта ёсць адзін агульны момант: Бог у пакаранне за той ці іншы грэх накрывае першапачатковую істоту чэрапам (вобраз чэрапа з'явіўся ў легендарных матывах якраз з сугучча «чэрап – чарапаха»). У выніку ад крылатай змяі застаюцца толькі галава і шыя, а жанчына-пляткарка пазбаўляецца магчымасці глядзець на іншых людзей і абгаворваць іх.

Выява чарапахі на рэверсе манеты (*малюнак 4*) мае рысы нябеснага, касмічнага і зямнога вобразаў, што адлюстроўвае змест легенды пра паходжанне гэтай істоты. Галава чарапахі мае рысы галавы змяі з джалам, якая, згодна з адным з варыянтаў беларускай народнай легенды, мела крылы, лятала ў небе і кідалася адтуль на людзей. Касцяны панцыр створаны ў выглядзе агульнага ромба, які сімвалізуе зямлю. У сваю чаргу, ён арнаментаваны дробнымі ромбамі, на якіх бачны стылізаваныя малюнкі хат, дрэў, палёў, а таксама жанчына-пляткарка, якая, згодна з міфалагічным аповедам, была пераўтворана ў чарапаху.

Вобраз мядзведзя займае важнае месца ў народных уяўленнях пра жывёл. Ён надзяляецца антрапаморфнымі рысамі, сімволікай урадлівасці, здароўя, сілы і нярэдка галоўнай роляй сярод лясных звяроў, выступае ў якасці памочніка чалавека, апекуна ўрадлівасці, даравальніка багацця. У славян мядзведзь лічыцца чыстай жывёлай. У беларусаў існуе павер'е, што нячыстая сіла не можа пераўвасабляцца ў мядзведзя і што мядзведзь мацнейшы за яе.

Выява на рэверсе манеты (*малюнак 5*) адлюстроўвае ўяўленне, якое зафіксавана ў славянскіх легендах, што мядзведзь паходзіць ад чалавека, які быў пакараны за правіннасць. Паводле распаўсюджанага беларускага павер'я, калі Хрыстос аднойчы спусціўся з неба і хадзіў па зямлі ў выглядзе старца, назіраючы, як жывуць людзі, ці аказваюць яны адзін аднаму літасць, адзін чалавек раптам з гырканнем выскачыў з-пад моста ў вывернутым кажуху, каб напужаць вандроўніка, – і стаў мядзведзем. Фігурка чалавека нагадвае пра гэта міфалагічнае здарэнне. Людзі верылі, што ў мядзведзя «чалавечыя» вочы, ступні і лапы з пальцамі, ён умее хадзіць на дзвюх нагах, любіць скакаць пад музыку, радуецца і гаруе, як чалавек, разумее чалавечае маўленне. У выяве на манеце чалавечыя рысы праглядваюцца ў абутку, рэштках вышыванага адзення жывёльнага персанажа. Яго міфалагічна-этыялагічны характар падкрэслены формай кола, у якое ўпісаны мядзведзь і якое заключана ўнутры самой фігуры. Яны разам рухаюцца нібы ў касмічнай прасторы.

На аверсе манеты ў касмічнае кола ўпісаны выявы чалавека і сілуэты мядзведзяў.

Легенды і міфы аб паходжанні агню – у ліку найбольш старажытных у многіх народаў, паколькі здабыванне і выкарыстанне агню – самая наглядная і ўніверсальная прыкмета вылучэння чалавека з жывёльнага свету. Часта ў міфах і легендах прысутнічае матыў выкрадання агню. Менавіта як істота, што прынесла людзям агонь, гіль (снягір) фігуруе ў адной вельмі каларытнай і старажытнай беларускай легендзе.

Гіль – сціплая, маленькая, першапачаткова шэрая птушка – у беларускім фальклоры выступае ў ролі своеасаблівага Праметэя. У беларускай легендзе гіль не выкрадае агонь, а, наадварот, выконвае даручэнне, якое было дадзена Богам. Ніхто з птушак і жывёл не змог выканаць боскага загаду – прынесці з неба на зямлю агонь. Толькі гіль справіўся з адказным даручэннем: ён паляцеў на неба, узяў агонь і вярнуўся з ім на зямлю. Але несці агонь аказалася вельмі няпроста: увесь час па дарозе з вышыні агонь моцна паліў гілю грудкі і шыйку. Гераічная птушка вытрывала боль і прынесла агонь на зямлю, а шыйка і грудкі так і засталіся ў яе чырвонымі як упрыгожанне і ўспамін пра колішні подзвіг. У беларусаў гіль лічыцца боскай, святой птушкай, якую нельга крыўдзіць.

На рэверсе манеты (*малюнак 6*) гіль адлюстраваны ў вобразе птушкі, якая прылятае ў Беларусь менавіта ўзімку. Сродкамі дэкаратыўнага рэльефу і карункавага арнаменту ў выглядзе сняжынак і




*Памятная манета «Легенда пра гіля» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2014 г.*

***Малюнак 6***




*Памятная манета «Легенда пра пчалу» серыі «Беларускія народныя легенды», 20 рублёў, 2017 г.*

***Малюнак 7***

ялінак на грудках, спінцы і крылах птушкі апасродкавана ўвасоблены міфалагічныя ўяўленні аб гераічным учынку гіля. Апаленая нябесным агнём птушка, якая прынесла яго людзям на зямлю ў дзюбе, пяшчотна прыцярушаная зімовым сняжком. Пра чырвоны колер грудак гіля нагадваюць круглыя ягадкі рабіны з зорачкай у цэнтры – улюбёны пачастунак гэтай птушкі. Іх лунанне ў прасторы разам з зорачкамі і карункавымі сняжынкамі надае вобразу птушкі касмічна-міфалагічнае сімвалічнае значэнне. Умоўная выява хаты сведчыць аб яднанні птушкі з чалавекам, дзякуючы якому людзі атрымалі хатні агонь і цеплыню.

Пчала лічыцца ў беларусаў божай казуркай, ад якой карысць і людзям (мёд), і Богу («жоўтыя воскі – Богу на свечкі»). Вулей, у якім жывуць пчолы, нярэдка параўноўваецца з Божым храмам: «Пчолкі гудуць – цэркаўку будуюць». Разламаць вулей ці борць лічылася цяжкім грахом, вялікім злачынствам, параўноўвалася з разбурэннем Божага храма.

Ва ўсіх славян шырока вядомая забарона забіваць пчалу. Калі злодзей, выдраўшы мёд з борці, загубіць рой, гэта, згодна з народным меркаваннем, злачынства, роўнае забойству чалавека. Паўсюдна ў беларусаў пра смерць пчалы кажуць, што яна «памерла», але ні ў якім разе не «здохла». Па беларускіх павер'ях, пчала жаліць толькі грэшніка, а водзяцца пчолы толькі ў добрых людзей.

Пчол часта параўноўваюць з людзьмі. Па-першае, яны працуюць падобна людзям і з'яўляюцца эталонам працалюбства. Па-другое, арганізацыя жыццядзейнасці пчалінага рою і размеркаванне працы ў ім вельмі падобныя на арганізацыю жыццядзейнасці чалавечага грамадства. Па-трэцяе, пчаліная сям'я нагадвае чалавечую сям'ю.

Пра паходжанне пчол у беларусаў існуе наступная паэтычная легенда. На камяні пасярод сіняга мора сядзела прыгожая дзяўчына і горка плакала. З яе слёз утвараліся пчолы і адляталі ад каменя. Па сінім моры ішоў Спас і ўбачыў, як плача дзяўчына. «Няхай жа і мая сляза будзе побач з тваімі». Са слязы Спаса ўтварылася пчаліная матка, і ўсе пчолы паляцелі да яе.

У сувязі з гэтым на рэверсе манеты (*малюнак 7*) пчала – маці-прарадзіцельніца ўсяго пчалінага роду. Яе цела, якое нараджае новых рабочых пчол, займае амаль усю прастору. Гэтая прастора ўяўляецца касмічнай, тут бесперапынна адбываецца адвечны кругазварот. Малюнкі вакол цэнтральнай выявы нагадваюць гледачу пра старажытны бортны промысел. Пчолы нараджаюцца, вылятаюць у вялікі свет з борці – дупла або калоды на дрэве. На такое дрэва бортнік – чалавек, які даглядае лясных пчол і здабывае мёд, ставіць знак уласнасці – сваё кляймо, бортны знак, выява якога нагадвае таямнічыя руны.

Кроплі на касмічным фоне нагадваюць адначасова слёзы дзяўчыны, якой паспачуваў сам Гасподзь Бог, і кроплі жыватворнага лекавага мёду. Дэкаратыўнае вырашэнне цела пчалы-маткі спалучае рысы прыроднага – нагадвае кветку сланечніка, тычынкі, з якіх пчолы бяруць пылок для мёду, само сонейка, і разам з тым рукатворнага – тканіну як знак культурнай прасторы існавання чалавека, які навучыўся з ашчаднасцю карыстацца прыроднымі дарамі – мёдам і воскам – і з удзячнасцю гадуе і даглядае пчол.

Серыя памятных манет «Беларускія народныя легенды» выпушчана Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь масавым накладам: 23 100 срэбных і 25 000 медна-нікелевых манет. Выбар тэмы і ўдалае вобразна-мастацкае вырашэнне гэтай серыі безумоўна з'яўляецца ўнёскам у папулярызацыю каштоўнасцей беларускай культуры ў свеце, сцвярджэннем яе адметнай нацыянальнай самабытнасці. Варта таксама падкрэсліць, што распрацоўка серыі можа лічыцца асабістым творчым дасягненнем мастачкі Аксаны Навасёлавай і пераканаўчым мастацкім сцвярджэннем існавання ў Беларусі самастойнай школы медальернага мастацтва.

***Бібліяграфічны спіс:***

*1. Итоги конкурса «Монетное созвездие – 2008» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gold10.ru/about/coin-constellation/history-of-contest/coin-constellation-2008/results.php-. – Дата доступа: 13.10.2019.*

*2. Монеты-победители [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://infobank.by/prosmotr-bankovskoj-novosti/itemid/4063/. – Дата доступа: 13.10.2019.*

# Images of the commemorative coins series «Belarusian Folk Legends»

**Volga LABACHEUSKAYA,** *Belarusian State University of Culture and Arts, Professor, Doctor of Arts, Minsk, Belarus, e-mail: lobachevskaja@tut.by.*

**Alena BOGANEVA,** *Centre for Research of the Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Science of Belarus, research scholar of the ethno linguistics and folklore, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: elboganeva@gmail.com.*

**Abstract.** *The article considers artistic and imaginary reflection of the plots of the Belarusian etiological legends about the origin of certain kinds of animals, birds, insects in the corresponding series of coins. The choice of the topic and successful artistic and imaginary solution of the series are a fine example of Belarusian culture values popularization around the world, confirmation of its unique national identity, and existence of the autonomous school of the medallic art in the Republic of Belarus.*